УДК 940.55 + 323.12(=30)(438)(091)

**С.А. Лукашанец**

# Дыскрымінацыя нямецкага насельніцтва ў Польшчы як перадумова да яго дэпартацыі (1945–1949 гг.)

Заканчэнне баявых дзеянняў у Еўропе, капітуляцыя Германіі ў маі 1945 г. і яе акупацыя прынеслі Польшчы важныя тэрытарыяльныя змены. Замест земляў, далучаных у 1939 г. да Беларусі, Літвы і Украіны, польская дзяржава ў якасці кампенсацыі атрымала ўсходнія тэрыторыі Германіі (за выключэннем акругі Кёнігсберга) да лініі рр. Одэр і Ныса-Лужыцкая. Згодна з рашэннем Патсдамскай канферэнцыі гэтыя землі ўвайшлі ў склад Польшчы, яшчэ раней на іх усталявалася польская адміністрацыя. Нягледзячы на тое, што калісьці яны ўваходзілі ў сярэднявечную польскую дзяржаву Пястаў (што дало падставу называць іх Вернутымі землямі), яны на працягу многіх стагоддзяў былі пад германскай уладай. Вынікам гэтага стала масавае засяленне іх нямецкімі каланістамі і германізацыя мясцовага насельніцтва. Усе жыхары Вернутых земляў на пачатак 1945 г. мелі нямецкае грамадзянства, ведалі нямецкую мову і за нешматлікім выключэннем адносілі сябе да нямецкага народа. Пад

уладай Польшчы апынуліся этнічна нямецкія землі, у выніку чаго ўзнікла пытанне аб іх неадкладнай інтэграцыі ў склад польскай дзяржавы.

Яшчэ ў перыяд вайны польская палітычная думка распрацавала план дзеянняў адносна пасляваеннага лёсу нямецкага насельніцтва, што пражывала як у межах Польшчы 1939 г., так і на тэрыторыях, якія будуць далучаны пасля вайны. Асноўным тэзісам гэтага плана была немагчымасць суіснавання польскага і нямецкага народаў у межах адной дзяржавы [1]. Адзіным шляхам да развязвання сітуацыі было прызнана добраахвотнае і прымусовае (дэпартацыя) высяленне немцаў на тэрыторыю пасляваеннай Германіі. Але такое высяленне (нават пасля двух-, трохразовага змяншэння лічбы нямецкага насельніцтва Вернутых земляў пасля эвакуацыі і масавай уцечкі апошніх месяцаў вайны) магло расцягнуцца на некалькі год [2]. Таму на гэты перыяд неабходна было выпрацаваць пэўную сістэму адносін да нямецкага насельніцтва ў новых межах Польшчы. Не дзіўна, што ў выніку пагаршэння польска-нямецкіх узаемаадносін за час вайны нямецкае насельніцтва было абмежавана ў сваіх правах і падвергнута дыскрымінацыі. І такая палітыка атрымала падтрымку амаль усіх слаёў польскага насельніцтва.

Польскае кіраўніцтва адразу ўзяло курс на «ўскладненне жыцця» нямецкага насельніцтва [3]. Пакуль Англія і СССР яшчэ не далі дазвол на пачатак дэпартацыі (дэпартацыя немцаў з Польшчы, а таксама Чэхаславакіі і Венгрыі, была санкцыяніравана Патсдамскай канферэнцыяй, але яе непасрэдны пачатак быў адкладзены да ўдакладнення колькасці «рэпатрыянтаў» і тэхнічнага забеспячэння), трэба было стварыць немцам у Польшчы такія ўмовы жыцця, каб яны самі зразумелі, што толькі выезд у Германію з'яўляецца для іх выратавальным, неабходна было падштурхнуць іх да высялення, бо месца ў пасляваеннай Польшчы ім не знойдзецца [3, dok. 37, s, 145]. Гэта можна было зрабіць толькі шляхам уціску на ўсе бакі штодзённага жыцця [4]. Асноўныя віды гэтага ўціску разгледжаны ніжэй.

**Права.** Дыскрымінацыя нямецкага насельніцтва пачалася з вызначэння іх прававога статуса. Жыхары Вернутых земляў мелі, натуральна, грамадзянства Германіі. Акрамя таго, у час нямецкай акупацыі Польшчы яе грамадзяне нямецкага паходжання атрымалі магчымасць атрымаць прывілеяванае адносна этнічных палякаў і яўрэяў становішча (шляхам упісання на т.зв. Нямецкі народны ліст – DVL). Упісанне на DVL часта было адзіным шляхам пазбегнуць рэпрэсій з боку гітлераўскіх улад, а ў шэрагу рэгіёнаў яно адбывалася ў прымусовай форме (асабліва ў Верхняй Сілезіі, на Памор'і і ў Гданьску). Такім чынам, польская палітычная думка адносіла да немцаў усіх, хто валодаў нямецкім грамадзянствам альбо знаходзіўся на DVL. Адпаведна вызначалася і кола асоб, на якіх распаўсюджваліся дыскрымінацыйныя абмежаванні. Прававая дыскрымінацыя немцаў пачалася яшчэ ў 1944 г., калі яны рашэннем польскага эміграцыйнага ўрада былі пазбаўлены польскага грамадзянства (датычылася, канешне, былых грамадзян Польшчы) [3, dok. 2, s. 109]. Дадзенае рашэнне, зразумела, мела больш сімвалічнае значэнне, хаця б з прычыны наступнага адхілення эміграцыйнага ўрада ад уплыву на польскія справы [5].

Новая, пракамуністычная ўлада ў Польшчы пайшла іншым шляхам. Згодна з дэкрэтам Польскага камітэта нацыянальнага вызвалення ад 31.07.1944 г., пацверджаным 4.11.1944 г., сама прыналежнасць да DVL з'яўлялася падставай для змяшчэння асобы ў турму [3, dok. 4, s. 114; dok. 7, s. 115]. У прававой практыцы польскага кіраўніцтва фолькcдойчэ рабіліся злачынцамі самі па сабе. Яны, як лічылася, здрадзілі падчас вайны польскаму народу, прыняўшы DVL. Згодна з дэкрэтам ад 28.06.1946 г. (г.зн. праз 10 месяцаў пасля пачатку працэсу рэабілітацыі) абмежавалі пакаранне толькі колам тых асоб, якія самі пісалі заявы аб упісанні на DVL [3, dok. 126, s. 232]. Толькі 20.07.1950 г.

выйшла пастанова аб адмене санкцыі за прыналежнасць да DVL [3, dok. 227, s. 362]. На працягу папярэдняга часу тысячы колішніх грамадзян Польшчы – немцаў па нацыянальнасці – траплялі ў канцэнтрацыйныя лагеры, пазбаўляліся маёмасці, выплочвалі штрафы.

Іншым было стаўленне да насельніцтва Вернутых земляў. Спецыфікай іх стану была прававая неабароненасць. Так, польскае кіраўніцтва і адміністрацыя, пачынаючы з пастановы 28.04.1946 г., трактавала іх як асоб без грамадзянства [3, dok. 111, s. 219]. Такая трактоўка вынікала з факту капітуляцыі і акупацыі Германіі, у выніку чаго яе былыя грамадзяне «гублялі» сваю дзяржаву, а грамадзянства новай яшчэ не атрымалі (іх называлі «грамадзяне былой Германскай Імперыі») [3, dok. 93, s. 197–198]. На практыцы гэта пазбаўляла немцаў Вернутых земляў абароны з боку якой-небудзь дзяржавы і, адпаведна, стварала магчымасці для рэпрэсій. Дарэчы, тэзіс аб «апатрыдстве» немцаў, на думку нямецкіх юрыстаў, быў абгрунтаваны толькі з 1949 г., калі ў ГДР і ФРГ з'явілася адпаведнае заканадаўства аб грамадзянстве жыхароў Германскай Імперыі [6]. Да гэтага моманту дзейнічаў закон 1913 г., які захоўваў за немцамі Вернутых земляў грамадзянства Германіі, нават па-за яе межамі. Атрыманне польскага грамадзянства было магчыма толькі для тых жыхароў Вернутых земляў, якія маглі даказаць сваё «польскае» («славянскае») паходжанне і нацыянальную прыналежнасць (такой магчымасцю скарысталася каля 1,1 млн. чалавек, т.зв. «аўтахтоны» – 1/6 насельніцтва). Толькі з 8.01.1951 г. немцы па ўласным жаданні змаглі атрымаць польскае грамадзянства [6, s. 57].

**Эканоміка.** Эканамічная дыскрымінацыя нямецкага насельніцтва была вельмі важнай для польскага пасляваеннага кіраўніцтва. Яна праяўлялася ў дзвюх асноўных формах: прымусовай працы і канфіскацыі маёмасці. Прымусовыя работы ўсіх здольных да працы немцаў адлюстроўвалі рэаліі пасляваеннага жыцця Польшчы. Па-першае, прымусовая праца была свайго роду пакараннем за калектыўную віну нямецкага народа і мела месца да 1947 г. [3, dok. 159, s. 273]. Па-другое, невялікая колькасць польскага насельніцтва Вернутых земляў рабіла немцаў адзінай крыніцай іх эканамічнай жыццяздольнасці. Знікненне немцаў з рабочых месцаў, асабліва ў Ніжняй Сілезіі, прывяло б да хуткага краху мясцовай прамысловасці. Замяніць немцаў можна было толькі паступова, у працэсе перамяшчэння на Вернутыя землі польскага насельніцтва. Так, вялікую значнасць набыло пытанне аб нямецкіх спецыялістах, занятых у асобных галінах прамысловасці (у лістападзе 1945 г. іх было 300 тыс.). Галоўнай задачай польскага кіраўніцтва робіцца ўтрыманне гэтых людзей на іх рабочых месцах, пакуль не будзе падрыхтавана адпаведная колькасць польскіх спецыялістаў [3, dok. 120, s. 227–228; dok. 193, s. 309]. Нават калі большая частка нямецкага насельніцтва была дэпартавана ў Германію, спецыялісты (у гэтым польскі ўрад быў салідарны з кіраўніцтвам прадпрыемстваў) заставаліся яшчэ пэўны час у Польшчы [3, dok. 86, s. 189; dok. 90, s. 193–194]. Вялікае значэнне для эканомікі Вернутых земляў мела прымацаванне нямецкага насельніцтва да дзяржаўных сельскагаспадарчых маёнткаў [7]. Асаблівасцю прымусовай працы было тое, што немцы знаходзіліся па-за межамі сацыяльнай абароны (яны мелі скарочаныя адпачынкі, у меншай ступені маглі карыстацца медыцынскай дапамогай), з іх зарплат, роўных польскім, аўтаматычна вылічалася каля 50% – у фонд адраджэння дзяржавы, фонд адбудовы Варшавы і інш. [3, dok. 106, s. 213–214; dok. 72, s. 178; dok. 114, s. 223]. Толькі з цягам часу праца немцаў стала аплочвацца на адным узроўні з працай палякаў, а самі немцы былі ўраўнаваны ў працоўным праве (гэты працэс расцягнуўся на некалькі гадоў і спачатку ахапіў толькі самых кваліфікаваных спецыялістаў) [3, dok. 125, s. 232; dok. 151, s. 261–262; dok. 228, s. 363–365].

Канфіскацыя нямецкай маёмасці (нерухомасці і зямельных надзелаў) была абвешчана яшчэ ў праграмных дакументах польскага кіраўніцтва, у ёй бачыўся інструмент падрыву самой асновы існавання нямецкага насельніцтва на Вернутых землях [3, dok. 1, s. 109]. Акрамя таго, канфіскаваныя маёнткі і будынкі прапаноўвалася раздаваць палякам, якія прыбылі з усходу. Канфіскацыя праводзілася звычайна адначасова з адпраўкай былога гаспадара ў канцлагер [3, dok. 71, s. 177]. Даволі частымі былі сітуацыі, калі былы нямецкі грамадзянін пасля зняволення ў канцлагеры атрымліваў праз суд рэабілітацыю, але па вяртанні не мог атрымаць назад сваю маёмасць, ужо перададзеную польскім перасяленцам [8]. У такім выпадку чалавек усё больш і больш схіляўся да выезду з Польшчы ў Германію (хоць ужо і не меў фармальных для гэтага падстаў).

**Канцлагеры.** Іх існаванне ў пасляваеннай Польшчы для цывільнага насельніцтва з'яўляецца адным з самых непрыемных эпізодаў дадзенага перыяду гісторыі. Яны ўзніклі адразу пасля прыходу да ўлады на тэрыторыі Польшчы і Вернутых земляў польскай адміністрацыі [3, dok. 17, s. 127–131]. Акрамя палітычных вязняў – удзельнікаў антыкамуністычнага супраціўлення, крымінальных злачынцаў, украінскіх актывістаў, там змяшчаліся немцы Вернутых земляў, «аўтахтоны» і фольксдойчэ. Прычынай зняволення звычайна была прыналежнасць да партыйнай і дзяржаўнай сістэмы Германіі [3, dok. 65, s. 172–174; 8, dok. 225, s. 348]. Агульнай тэндэнцыяй было змяшчэнне ў лагеры людзей, здольных да працы, але ў іх знаходзілася і вялікая колькасць старых, дзяцей і хворых, што пры недахопе лекаў і іншага забеспячэння параджала высокую смяротнасць [3, dok. 45, s. 152–155]. Прычынай смяротнасці было таксама і злоўжыванне з боку лагернага кіраўніцтва і катаванні [9]. У канцлагерах выкарыстоўвалася прымусовая праца вязняў (у тым ліку і за межамі лагераў).

**Рэпаланізацыя.** Пад паланізацыяй трэба разумець комплекс дзеянняў польскай улады па наданні Вернутым землям «польскага характару» і знішчэння ўсіх слядоў таго, што яны калісьці належалі немцам [3, dok. 199, s. 314–316]. Хоць гэты працэс пачаўся з самага вызвалення Польшчы, але доўгі час меў хаатычны і неасэнсаваны характар [3, dok. 32, s. 142; 8, dok. 234, s. 358]. Толькі 24.04.1947 г. выйшла распараджэнне Міністэрства Вернутых земляў аб сціранні слядоў «niemczyzny». Акцыя атрымала назву «рэпаланізацыі» (што адлюстроўвала жаданне польскага кіраўніцтва лічыць яе толькі вяртаннем да калісьці сапсаванага стану спраў) [4, s. 117]. Асноўным зместам рэпаланізацыі было знішчэнне ўсіх назваў на нямецкай мове, перавыданне карт з польскімі назвамі гарадоў і населеных пунктаў, змена на польскія ўсіх гандлёвых марак (і нават падставак пад піва ў барах), выдаленне з продажу кніг на нямецкай мове, змена прозвішчаў і імёнаў для «аўтахтонаў» на польскі лад [8, dok. 342, s. 489–490; dok. 510–511; dok. 358, s. 512; dok. 370, s. 527–528]. Асаблівая ўвага надавалася публічнаму выкарыстанню нямецкай мовы: заўважаны за гэтым чалавек мог накіроўвацца на новую верыфікацыю з магчымай адменай польскага грамадзянства і дэпартацыяй у Германію [8, dok. 326, s. 467–468; 329, s. 472].

**Знешняе выдзяленне немцаў.** Яно было асобнай ганебнай формай дыскрымінацыі. Так, у першыя пасля вызвалення тэрыторый тыдні на ваяводскім узроўні выходзілі загады аб нашэнні ўсімі немцамі спецыяльных адзнак, звычайна літары N [3, dok. 18, s. 131–132; 8, dok. 243, s. 368]. Праўда, такія метады не знаходзілі падтрымкі цэнтральнага кіраўніцтва Польшчы, бо, на яго думку, пераймалі гітлераўскую практыку [3, dok. 68, s. 175]. Было і больш прагматычнае тлумачэнне: нашэнне такіх знакаў у некаторых рэгіёнах (асабліва ў Ніжняй Сілезіі), дзе колькасць палякаў была мізэрнай, стварала б для немцаў адчуванне лічэбнай перавагі, што магло негатыўна паўплываць

на ўсталяванне поўнага польскага кантролю над новаатрыманымі тэрыторыямі.

Непасрэдна дэпартацыя немцаў з Польшчы пачалася ў лютым 1946 г. і цягнулася да 1949 г. уключна. За гэты перыяд у савецкую і англійскую акупацыйныя зоны было выселена каля 2 млн. чалавек нямецкай нацыянальнасці. У выніку немцаў у Польшчы засталося каля 125–160 тыс. (у параўнанні з 3,6 млн. на лета 1945 г.) [10]. Вернутыя землі былі заселены палякамі з былых «крэсаў усходніх» і Цэнтральнай Польшчы [11]. Штодзённая шматбаковая дыскрымінацыя паступова прызвычаіла нямецкае насельніцтва да думкі аб непазбежнасці дэпартацыі. Нямецкае жыццё на Вернутых землях было цалкам зруйнавана. Адпаведна знікла неабходнасць у тых рашучых дыскрымінацыйных сродках, якія прымяняліся на працягу папярэдняга перыяду. У 1950 г. з'явіліся нямецкія школы [12]. У 1951 г. было ўнармавана прававое становішча польскіх немцаў, шэрагам пастаноў была адменена працоўная дыскрымінацыя. Дыскрымінацыя паступова знікла, але адмоўнае стаўленне да польскіх немцаў захоўвалася на працягу дзесяцігоддзяў.

Такім чынам, у якасці высновы можна адзначыць, што дыскрымінацыя нямецкага насельніцтва закранула ўсе бакі жыцця польскіх немцаў і, нягледзячы на антыгуманны характар, стала эфектыўным сродкам не толькі для спрыяння ў іх дэпартацыі, але і для паспяховай інтэграцыі Вернутых земляў у склад Польшчы, бо разбурыла на іх жыццёвы свет немцаў.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Madajczyk P.*** Niemcy polscy. 1944–1989. – W., 2001. – S. 17.
2. ***Lippóczy Piotr, Walichnowski Tadeusz.*** Przesiedlenie ludności niemieckiej z Polski po II wojne światowej w świetle dokumentów. – W., Łodź, 1982. – Dok. 3, s. 56–59; dok. 5, s. 62–68; dok. 6, s. 68–69.
3. ***Niemcy w Poisce 1945–1950.*** Wybór dokumentów. T. 1–4. – T. 1: Władze i istytucje centralne. Województwo olsztyńskie. – W., 2000. – Dok. 30, s. 140–141.
4. ***Nitschke B.*** Wysiedlenie czy wypędzenie? Ludność niemiecka w Polsce w latach 1945–1949. – Toruń, 2000. – S. 71.
5. ***Драноўскі Я.*** Улада й апазыцыя. Спроба інтэрпрэтацыі палітычнай гісторыі пасляваеннай Польшчы // Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысленьне. – Мн., 2000. – С. 98.
6. ***Ociepka B.*** Niemcy na Dolnym Śląsku w latach 1945–1970. – Wrocław, 1992. – S. 55.
7. ***Wysiedlenie Niemców i osadnictwo ludności polskiej na obszarze Krzyżowa-Świdnica (Kreisan-Schweidnitz) w latach 1945–1948.*** Wybór dokumentów. – Wrocław, 1997. – Dok. 6, s. 114.
8. ***Niemcy w Polsce 1945–1950.*** Wybór dokumentów. T. 1–4. – T. 2: Polska centralna. Województwo śląskie. – W., 2000. – Dok. 261, s. 390; dok. 352, s. 506–507.
9. ***Национальная политика в странах формирующегося советского блока.*** 1944–1948. – М., 2004. – С. 343.
10. ***Banasiak S.*** Przesiedlenie Niemców z Polski w latach 1945–1950. – Łódź, 1969. – S. 222.
11. ***Sula D.*** Działalność przesiedleńczo-repatriacyjna Państwowego Urzędu Repatriacyjnego w latach 1944–1951. – Lublin, 2002. – 199 s.
12. ***Mniejszości narodowe w Polsce.*** – W., 1998. – S. 78.



## SUMMARY

*The article is devoted to the discrimination of Germans in Poland after the Second World War. The emphasis is done on their legal status and economical activities.*


*Поступила в редакцию 10.03.2006*